# *СУМЕСНАЕ РАЗУМЕННЕ*

**14 студзеня 2026 года. За акном амаль -15. Завіруха. Усе святкуюць Стары новы год. А слухачы Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы верныя сабе і нашаму грамадска-адукацыйнаму праекту! Сустрэліся зноў і працягнулі разам вывучаць мастацкія тропы.**

Дзякуючы нашаму адзінству і вельмі няпростая тэма заняткаў «Сродкі мастацкай выразнасці. Сінекдаха» падалася не такой складанай. Па традыцыі ў офісе Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі – пісьменнікі і аматары літаратуры featured рознага ўзросту: члены СПБ, гарадскога літаб’яднання «Надзея» і іншыя. Прыемна, што нашы заняткі ўжо не раз наведваюць прадстаўнікі розных пакаленняў адной сям’і. Нават слова «сям’я» гучала ў ходзе сустрэчы ў вельмі каштоўным, хоць і пераносным сэнсе.



У тэарэтычным блоку слухачы пазнаёміліся з паняццем сінекдахі, пералічылі яе асаблівасці, функцыі, віды, значэнні. Паўтарылі пройдзены матэрыял пра метанімію. Папрацавалі над вызначэннем адрозненняў метаніміі, сінекдахі, метафары. З дапамогай прыкладаў паспрабавалі на практыцы прымяніць тэарэтычныя веды аб дадзеным сродку мастацкай выразнасці (складалі сказы з ім) і прааналізавалі атрыманыя вынікі. Сутыкнуліся з нечаканай праблемай няўдалых, але, на жаль, папулярных прыкладаў.

Атмасфера студзеньскага занятку ў пісьменніцкім офісе была вельмі прыязнай і канструктыўнай. У калектыве аднадумцаў паміж людзьмі адчувалася духоўная блізкасць. А гэта вельмі натхняе, паверце. З старажытнагрэцкай мовы «сінекдаха» *(συνεκδοχή, synekdoche)* перакладаецца, як «сумеснае разуменне». Для нашай літшколы вельмі сімвалічна!




**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** у Гродзенскай грамадскай літаратурнай школе ідуць заняткі па тэме «Сродкі мастацкай выразнасці. Сінекдаха», тэарэтычны, практычны і аналітычны блокі. Офіс Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, 14 студзеня 2026 года.




Январь Студзень January
Февраль Люты February
ПАДЗЯКА
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ
ГА "САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ"
Диплом


ПАДЗЯКА
ЗА СУПРАЦОЎНІЦТВА ПА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ КНІГІ І ЧЫТАННЯ Ў 2022 ГОДЗЕ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ ГА "САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ"
Дыплом
узнагароджваецца
Гродзенскае абласное аддзяленне ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"
January
February








GLK
FASHION








NICE


Energy
Saving












**Да сустрэчы на наступным занятку!**

*Фота* **Анатоля Апанасевіча**